

# «СЁННЯ НЯМА ТЫХ ПЫТАННЯЎ, ШТО НЕ МЕЛІ Б ПАЛІТЫЧНЫ ХАРАКТАР»

**Якія задачы паставіў Прэзідэнт перад сваёй Адміністрацыяй**

(Працяг на стар. 2–4)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 ЧЭРВЕНЯ 2025 г. ПЯТНІЦА № 113 (30501)



**+TV ПРАГРАМА**
«НЯБЕСНЫЯ ЛАСТАЎКІ»

# СПРАВЯДЛІВА, ПРАЗРЫСТА І БЕЗ МІТУСНІ

**12 чэрвеня пачаўся прыём дакументаў у першыя класы беларускіх школ і гімназій. Чакаецца, што сёлета ўстановы адукацыі прымуць 90 тысяч першакласнікаў**



Працэс будзе адбывацца згодна з новымі хутчэй не правіламі, а мерамі, якія дапамогуць дзецям і іх бацькам зрабіць першы крок у краіну ведаў максімальна зручным і справядлівым. Яны таксама дазволяць атрымлівацца актуальную інфармацыю па прыёме ва ўстанову адукацыі не выходзячы з дому — усё размешчана на сайтах школ і гімназій.

СТАР. 8–9

Фота Лізаветы ГОЛАД.



БЕЗ ПЕРАДАПЛАТЫ І АГЕНТАЎ 6–7



ТАМАТ І ЯГО ХВАРОБЫ 16

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# МІШКУ — НА МУШКУ?



Фота Андрэя КАРАБЕЛЬНІКАВА.

**З 1 ліпеня ў Беларусі адкрыецца паляўнічы сезон на бурых мядзведзяў**

Паляванне на мядзведзяў было забаронена ў Беларусі ў 1930-я гады. У 1981 годзе звер быў занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі. Яна аднаўляецца адзін раз на 10 гадоў. 31 сакавіка 2025-га ўступіў у сілу аднаўлены спіс рэдкіх і знікаючых відаў дзікіх жывёлін і дзікарослых раслін, зацверджаны Міністэрствам прыроды і аховы навакольнага асяроддзя. Спіс скарэктаваны з улікам бягучай сітуацыі.

СТАР. 6–7



Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2025 года

**Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.**

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!**

ISSN 1990 — 763X

# «СЁННЯ НЯМА ТЫХ ПЫТАННЯЎ,

## Якія задачы паставіў Прэзідэнт

**Жорсткія патрабаванні, крытычныя заўвагі і падыходы, якія павінны выконвацца пры вырашэнні найважнейшых дзяржаўных пытанняў, былі агучаныя на сустрэчы з палітычным штабам краіны. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сабраў нараду з кіраўніцтвам Адміністрацыі Прэзідэнта, на якой актуалізаваў задачы і расставіў акцэнты.**



Найперш кіраўнік дзяржавы растлумачыў, чым выклікана неабходнасць правядзення мерапрыемства. Ён звярнуў увагу, што ўстанавілася добрая практыка абмеркавання злабадзённых пытанняў з урадам на ўзроўні Прэзідэнта. «Хацелася б, каб падобная практыка назаўжды засталася і ў нашай рабоце. Бо шмат мы гаворым пра тое, што Адміністрацыя Прэзідэнта — гэта апошні этап, апошні рубеж, апошні бар'ер. Гэта сапраўды так, перад прыняццем рашэння ў Прэзідэнта», — падкрэсліў беларускі лідар. Ён заўважыў, што сустрэчы ў такім складзе праходзяць вельмі рэдка, не сістэматычна. Таму, зрабіў акцэнт Аляксандр Лукашэнка, трэба ўвесці такую практыку па прыкладзе работы з урадам — па неабходнасці.

### КАМУ ЯШЧЭ РЫХТАВАЦЦА ДА СУР'ЁЗНАЙ РАЗМОВЫ

Прэзідэнт анансаваў нараду на сваім узроўні з кіраўніцтвам і работнікамі Нацыянальнага банка. «Затым нам трэба арганізаваць і правесці з'езд вучоных. За навуку трэба брацца вельмі сур'ёзна. Гэта сфера ў Адміністрацыі Прэзідэнта практычна выключана, і я не бачу Адміністрацыі ў рабоце па арганізацыі працэсу навуковай дзейнасці, асабліва атрымання выніку. Таму ў сувязі са зменамі, якія адбыліся і адбудуцца ў кіраўніцтве Акадэміі навук... Гэта таксама тэма, якая датычыцца не толькі мяне, але і вас перш за ўсё. Мы пагаворым пра будучыню нашай навукі на з'ездзе вучоных», — папярэдзіў Прэзідэнт. І яшчэ адно мерапрыемства, правядзенне якога анансаваў Аляксандр Лукашэнка, — нарада па развіцці Віцебскай вобласці. «Трэба паглядзець, што мы там стварылі добрага і які вынік ад той рэформы, якая была прапанаваная яшчэ ў часы Мікалая Мікалаевіча Шарснёва (маецца на ўвазе стварэнне інтэграцыйных структур у сельскай гаспадарцы. — **«Зв.»**). Ну і іншыя пытанні, якія міма Адміністрацыі не пройдуць», — патлумачыў ён.

### «ВАША РАБОТА — ГЭТА «ГАРАЧАЯ ПАТЭЛЬНЯ»

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што дамоўленасць праводзіць нарады з Адміністрацыяй Прэзідэнта былі дасягнутыя ўжо даўно. Але, адзначыў ён, не заўсёды атрымлівалася ўвасобіць гэту дамоўленасць у жыццё. «Выбарчая кампанія завяршылася. Абяцанні дадзены, стратэгія палітычнага, эканамічнага, сацыяльнага развіцця краіны вызначана на наступныя пяць гадоў. Па асобных кірунках на Усебеларускім народным сходзе мы яшчэ раз закранём гэту праблему. Вельмі сур'ёзна трэба рыхтаваць УНС. І абмяркуем найбліжэйшыя нашы планы, планы на сярэднетэрміновую перспектыву, прынамсі на пяцігодку», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка назваў Адміністрацыю палітычным штабам Прэзідэнта, кантрольным органам і бар'ерам для іншых структур перад кіраўніком дзяржавы. Разам з тым Адміністрацыя Прэзідэнта надзеленая шэрагам функцый, якія ўскладаюць немалую адказнасць за вынік, да якога імкнецца ўся краіна. «Праз вашу экспертызу праходзяць практычна ўсе ключавыя прызначэнні і рашэнні, якія прымаюцца на ўзроўні Прэзідэнта. Я не перабольшваю, калі кажу, што праца ў Адміністрацыі Прэзідэнта, кіраўніка Адміністрацыі, кіраўніцтва — гэта «гарачая патэльня», — сказаў ён. Мэтай нарады беларускі лідар назваў вызначэнне «вузкіх месцаў», карэкціроўку падыходаў да вырашэння задач, якія стаяць перад краінай. Аляксандр Лукашэнка пералічыў асноўныя з іх.

### ПЕРШАЕ — кадры. Памылкі тут недапушчальныя

Кіраўнік дзяржавы назваў гэты кірунак першым, галоўным у рабоце Адміністрацыі Прэзідэнта, ды і ўсёй краіны. «Фарміруем кожны год, абнаўляем кадравыя рэзервы,

## Даслоўна

### Дзмітрый Крутой: «Галоўны крытэрый для Прэзідэнта — неабыякавае стаўленне да справы»



У размове з журналістамі кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый Крутой падкрэсліў, што сутнасць нарады ў кіраўніка дзяржавы заключалася не ў справаздачах і аналізе дзейнасці адміністрацыі, а найперш, ва ўстаноўках Прэзідэнта. Дзмітрый Крутой адзначыў, што, нягледзячы на станоўчыя моманты, кіраўнік дзяржавы ўвесь час знаходзіць аспекты, у якіх патрабуе ад людзей значна большай аддачы. «Мы практычна штодня кантактуем з кіраўніком дзяржавы і праз дакументы, і па тэлефоне. У 90 % выпадкаў Прэзідэнт патрабуе больш якаснай і больш сур'ёзнай работы і стаўлення да справы. І сёння Прэзідэнт сказаў, што для яго галоўны крытэрый — гэта неабыякавае стаўленне да даручанай справы», — адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Дзмітрый Крутой расказаў, што сёння ў Адміністрацыі Прэзідэнта працуе 114 чалавек — роўна столькі ж, колькі было ў момант стварэння Адміністрацыі 30 гадоў таму. Але, падкрэсліў ён, пры дынаміцы работы, колькасці матэрыялаў, пытанняў, якія абмяркоўваюцца, хуткасць павялічылася ў разы. Гэта патрабуе ад супрацоўнікаў пабольш самааддачы і вялікіх намаганняў.

Дзмітрый Крутой асобна звярнуў увагу на такую важную частку работы Адміністрацыі Прэзідэнта, як звароты грамадзян. «На сёння мы дамагліся пакуль таго, што колькасць скаргаў не расце. Апошнія некалькі гадоў яна проста стабільная — прыкладна 18 тысяч. Каля 10 % ад агульнай колькасці зваротаў нашых людзей па краіне паступае непасрэдна на імя кіраўніка дзяржавы, непасрэдна ў Адміністрацыю. Мы, натуральна, стараемся сістэматызаваць увесь гэты паток. Укараняем элементы інфарматызацыі і лічбавізацыі, каб вылучаць тыповыя просьбы, якія паўтараюцца шмат разоў, для паскарэння іх разгляду. Прэзідэнт запатрабаваў, каб мы з усяго ліку зваротаў стараліся вылучаць пытанні «на злобу дня», якія маюць сістэмны характар, тое, што сапраўды турбуе людзей не толькі ў канкрэтным населеным пункце, а з'яўляецца праблемай у цэлым або для рэгіёна, або для краіны», — расказаў Дзмітрый Крутой. Паводле яго слоў, Прэзідэнт гатовы пры наяўнасці такіх тэм «знізу» праводзіць больш тэматычных нарад, у тым ліку і выязных, калі нейкая праблема сапраўды турбуе людзей.

На нарадзе актыўна абмяркоўвалася праблематыка Года добраўпарадкавання. Дзмітрый Крутой расказаў, што Прэзідэнт пакуль не вельмі задаволены, у тым ліку і інфармацыйным суправаджэннем у плане прывядзення ў парадак знакавых месцаў і аб'ектаў. «Штомесяц кожны рэгіён такія добраўпарадкаваныя тэрыторыі павінен паказваць нашым людзям. Журналісты, адпаведна, гэта асвятляць, — звярнуў увагу ён. — Прэзідэнт вельмі карэктна, але настойліва гаворыць аб адказнасці за недахопы, звязаныя з добраўпарадкаваннем. Прычым гэта адказнасць узаемная — і ўлады, і грамадзян». Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта звярнуў увагу, што з улад усіх узроўняў Прэзідэнт пытаецца вельмі жорстка. А што датычыцца грамадзян, то па ўзрослым патоку зваротаў за апошні перыяд стала бачна, што многія жывуць з псіхалогіяй утрыманцаў. Гэта добра відаць на прыкладзе добраўпарадкавання прысядзібных участкаў. Па словах кіраўніка Адміністрацыі, многія фактычна патрабуюць прыводзіць у парадак іх тэрыторыю, а не займаюцца гэтым самастойна. «Фінансавыя магчымасці мясцовых Саветаў дэпутатаў, якія з'яўляюцца першасным звяном у зносінах з грамадзянамі, абмежаваныя. Разам з тым Прэзідэнт даручыў у якасці эксперыменту ў некаторых абласцях прадугледзець сродкі для гэтых нізавых структур, каб мясцовыя праблемы маглі вырашыць на мясцовым узроўні. Пакуль гэта пілотная гісторыя. На ўсю краіну мы яе не распаўсюджвалі, каб зразумець аб'ём рэсурсаў і паток узаемных зваротаў, каб не пладзіць дзесьці штучна тэму сацыяльнага ўтрыманства», — заявіў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Журналісты звярнулі ўвагу, што шмат скаргаў і нават зваротаў публікуецца ў сацыяльных сетках. Дзмітрый Крутой адзначыў, што гэта ўжо ўспрымаецца як данасць. Пры гэтым, адзначыў ён, гучаць меркаванні аб тым, што не трэба рэагаваць на кожны зварот у TikTok, бо там нямала правакатараў, якія жадаюць вывесці на эмоцыі або зрабіць сабе рэйтынгі. «Але ў Прэзідэнта простая пазіцыя: мы павінны бачыць абсалютна ўсё інфаполе. Для нас няма важных і няважных інфанагод, таму мы апрацоўваем усе звароты, якія паступаюць. І ўжо з вопытам тых людзей, супрацоўнікаў, якія імі займаюцца, мы бачым, што сапраўды мае пад сабой нейкую сур'ёзную аснову, а што проста ідзе як хайповая, фонавая гісторыя, — заявіў кіраўнік Адміністрацыі. — Наяўнасць сацсетак, TikTok і іншых сучасных фарматаў камунікацыі ўскладняе работу ў гэтым сегменце, таму што ў велізарным мностве не хочацца ўпусціць нешта важнае. Аднак мы апрацоўваем абсалютна ўсё. І гэтым здзіўляем, дарэчы, нашых суседзяў, якія кажуць: «Гэта толькі ў Беларусі магчыма, што вы прама ўсё чытаеце, усё глядзіце і на ўсё стараецеся рэагаваць». Такія патрабаванні нашага лідара».

### Вольга Чупрыс: «Дзяржава з'яўляецца эфектыўнай тады, калі мы эфектыўна працуем»



Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Вольга Чупрыс расказала, што на нарадзе ішла размова аб выкананні даручэння кіраўніка дзяржавы па рэвізіі заканадаўства. Прэзідэнта ў першую чаргу цікавіла лічба — наколькі стала менш прававых актаў. «22 тысячы, вельмі вялікая лічба. Але гэта далёка не мяжа. Работа яшчэ працягваецца, апрацавана каля 30 % усіх матэрыялаў. Адпаведна, да канца года мы яшчэ навярстаем вельмі многае. Адміністрацыя Прэзідэнта кантралюе гэты працэс. Працуем вельмі шчыльна з апаратам Савета міністраў, Міністэрствам юстыцыі і іншымі міністэрствамі», — адзначыла Вольга Чупрыс. Яна прывяла яшчэ адну цікавую лічбу, якая паказвае, як з дапамогай тэхнічных рашэнняў карэкціровак можна паменшыць колькасць нарматыўных актаў. «Савет Міністраў скараціў колькасць пастаноў за пяць месяцаў гэтага года на 25 % у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. У папярэднія перыяды

# ШТО НЕ МЕЛІ Б ПАЛІТЫЧНЫ ХАРАКТАР»

## перад сваёй Адміністрацыяй

а кандыдатаў на пасаду, як толькі адкрываецца вакансія, шукаем доўга і знаходзім не адразу. І нават у кадравы рэестр кіраўніка дзяржавы. Дапускаюцца факты ўнясення Прэзідэнту недастаткова прапрацаваных кадравых прапаноў, — пазначыў праблему Аляксандр Лукашэнка. — Адміністрацыя Прэзідэнта павінна прынцыпова і жорстка падыходзіць да адбору прапанаваных кандыдатаў. Кадравыя памылкі недапушчальныя. Вы сваімі «шчупальцамі» павінны бачыць кадры ў цэлым, пачынаючы ад калгасаў, саўгасаў і заканчваючы самымі высокімі ўзроўнямі. Але абмяркоўваць прапановы для ўнясення Прэзідэнту вы павінны калектыўна. Не капрыз кіраўнікоў адміністрацыі ці дваіх — траіх чалавек. А вы калектыўна павінны праштудзіраваць тую ці іншую кандыдатуру».

Прэзідэнт папярэдзіў, што адказнасць за кадравыя прызначэнні будзе павышацца.

### ДРУГОЕ — ідэалогія. Трэба размаўляць з людзьмі і пазбягаць фармалізму

«Калісьці ўсе хаваліся ад гэтага тэрміна. Але мною было ўведзена паняцце «ідэалогія». Як бачыце, сёння ўсе загаварылі аб ідэалогіі, нават амерыканцы. Ад гэтага сыходзіць не трэба: ніхто нічога лепш не прыдумаў, як пазначыць працэс усялякіх пераўтварэнняў, мэт і гэтак далей у галаве чалавека, пакладзеных на паперу. Але «зямных». Не так, як гэта было ў савецкія часы, — усе імкнуліся пабудаваць камунізм, але ніхто не ведаў, што гэта такое», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Ідэалогія, акцэнтаваў ён, павінна ісці «ад зямлі». Прэзідэнт таксама звярнуў увагу, што важна не толькі прадставіць народу ідэалогію, але і выпрацаваць нацыянальную ідэю, якая магла б захапіць душы і сэрцы, розум людзей. «Можа, яна і ёсць. Некаторыя кажуць: патрыятызм, яшчэ штосьці. Але я не адчуваю, што ёсць такая ідэя. І калі мы яе выпрацуем, — а гэта павінна быць для нас вельмі важнай мэтай, якая захопіць усё, што ад сэрца да розуму чалавека, — гэта вяршыня», — адзначыў беларускі лідар.

Паводле слоў Прэзідэнта, вынікі дзейнасці ідэалагічнай вертыкалі неаднойчы падвяргаліся крытыцы. Прымаліся розныя рашэнні. Але, па словах Аляксандра Лукашэнкі, у гэтай сферы застаецца вельмі шмат фармалізму. У прыклад ён прывёў дні інфармавання, якія часта праводзяцца па прынцыпе: «прыйдзем у працоўны калектыў, чым больш людзей збяром у зале — тым лепей». «А вынік? Я папярэджваў, што ідэалагічныя работнікі — гэта рэдкасць. Гэта найвялікшая рэдкасць — чалавек, які прыйдзе ў любую залу, і захопіць увагу гэтай залы, і скажа не толькі тое, што хоча чуць чалавек, але і тое, што нават непрыемна, але чалавек гэта зразумее, чалавек гэта ўспрыме», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што многія службовыя асобы хварэюць на тое, каб сабраць як мага больш людзей, нешта ім сказаць. Але ў слухачоў сказанае не знаходзіць ніякага водгуку. «Усе вы таленавітыя людзі ў чымсьці. Вы павінны вызначыцца: калі вы ідзяце да людзей — колькі перад вамі павінна быць чалавек. Калі вы валодаеце талентам і псіхалогіяй нешта данесці дзесяці людзям, дык лепш дзесяці скажыце. Гэта потым разыдзецца ў працоўным калектыве. Але не старайцеся ў кучу сабраць і паказаць вялікую працу, — параіў кіраўнік дзяржавы. — Адзін з такіх прыкладаў, які я часта назіраю за чыноўнікамі. Не трэба да гэтага імкнуцца, гэта будзе на шкоду».

Прэзідэнт адзначыў, што трэба выбудоўваць ідэалагічную работу і, самае галоўнае, размаўляць з людзьмі. «Вы прафесіяналы, вы спецыялісты. І вы лепш за ўсё адчуваеце, дзе вы штосьці можаце. Самакрытычна трэба да гэтага падыходзіць», — параіў беларускі лідар. Паводле яго слоў, выбудоўваючы ідэалагічную работу ў краіне, не трэба імкнуцца праводзіць больш нарад, пасяджэнняў і форумаў. Хаця б таму, што гэта дорага. «Прымаючы тое ці іншае рашэнне, вы думайце, у што гэта абыдзецца», — адзначыў ён. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што выклік людзей з рэгіёнаў на нарады і мерапрыемствы ў Мінск абыходзіцца нятанна, бо кожны едзе на службовым аўтамабілі і часцей за ўсё гэта дзяржаўныя выдаткі. У працяг тэмы з камандзіроўкамі Прэзідэнт звярнуў увагу, што гэта праблема ёсць і сярод вышэйшых службовых асоб. «Я падпісаў (камандзіроўку) міністру, дапусцім. А за міністрам цэлы ж хвост едзе. Таму жалезна вазьміце на жорсткі кантроль і папярэдзьце Прэм'ер-міністра, які ўносіць прапановы, і іншых. Гэта велізарныя грошы, — звярнуў увагу беларускі лідар. — У нас і за Прэзідэнтам цэлая кавалькада. Давайце з нябёсаў будзем апускацца на зямлю. Таму прыводзьце ўсё ў парадак, не гледзячы ні на асобы, ні на рангі».

Працягваючы размову пра ідэалагічную работу, Прэзідэнт нагадаў пра Дырэктыву № 12 «Аб рэалізацыі асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы». «Я думаю, што Адміністрацыя Прэзідэнта вельмі сур'ёзна падышла да распрацоўкі гэтага дакумента. І гэтая дырэктыва павінна была вывесці ідэалагічную работу на якасна новы ўзровень», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што пакуль гэтага не заўважыў. «У мяне вопыту хапае. Я працаваў ідэалагічным работнікам, ведаю, што такое кадры і гэтак далей. Таму я магу адразу ацаніць сітуацыю і вашы дзеянні. Не спрабуйце фармальна падыходзіць да тых ці іншых пытанняў. Прынцыповым чынам прапрацоўвайце іх», — даў рэкамендацыі кіраўнік дзяржавы.

Па словах беларускага лідара, сёння трэба ўмацоўваць кадравы склад ідэалагічнай вертыкалі, перафарматаваць інфармацыйна-тлумачальную работу з насельніцтвам, вызваліць ідэолагаў ад неўласцівых функцый. Ён зрабіў акцэнт на тым, што праз тэлебачанне, інтэрнэт, ды і наўпрост вочы ў вочы з людзьмі трэба размаўляць адкрыта. Яны чалавечае стаўленне ацэняць, упэўнены кіраўнік дзяржавы.

### ТРЭЦЯЕ — нарматыўныя дакументы. Пакінуць толькі тое, што трэба

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што актуальнымі застаюцца пытанні празмернасці заканадаўчага масіву, дубліравання нормаў. «Трэба арганізаваць, трэба паглядзець усё, што мы нарабілі за апошнія 10, 20, а можа, і 30 гадоў і адсекчы тое, што нам сёння не трэба. Пакінуць толькі тое, што трэба», — нагадаў аб сваім даручэнні Прэзідэнт. — Варта звярнуць увагу на якасць экспертнай прапрацоўкі прававых ініцыятыў. Нам патрэбныя больш дакладныя прагнозы прававога ўздзеяння ўнесеных урадам і дапрацаваных вамі праектаў заканадаўчых актаў на сярэднетэрміновую перспектыву».

*(Працяг глядзіце на стар. 4)*

неяк было модна ўносіць некалькі змяненняў у адну пастанову ў адзін дзень: ад кожнага органа-ініцыятара паступалі свае прапановы і яны не акумуляваліся. Гэта было вельмі нязручна. Пасля рэвізіі, калі мы выявілі гэта, Савет Міністраў пайшоў па зусім іншым, аптымальным шляху», — расказала намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. Паводле яе слоў, гэты прыклад сведчыць, што можна жыць і працаваць эфектыўна. «Сёння Прэзідэнт скончыў нашу сустрэчу словамі, што дзяржава эфектыўная не маштабамі і не памерамі. Дзяржава з'яўляецца эфектыўнай тады, калі мы эфектыўна працуем. Гэта адлюстравалася і ў рабоце па рэвізіі заканадаўства», — адзначыла Вольга Чупрыс.

На нарадзе ў Прэзідэнта таксама абмяркоўваліся некаторыя тэхнічныя рашэнні, якія прымаюцца для зручнасці карыстання сістэмай нарматыўна-прававых актаў, работы з ёй, падрыхтоўкі праектаў. «З 1 ліпеня пачне працаваць новая аўтаматызаваная сістэма падрыхтоўкі праектаў актаў, у якой ужо ёсць элементы штучнага інтэлекту. Праграма будзе дапамагаць фарміраваць тэкст нарматыўна-прававога акта. Гэта, вядома, толькі пачатак, але мы ўжо бачым і далейшы шлях», — адзначыла намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Вольга Чупрыс, падкрэсліла што на нарадзе Прэзідэнт падняў важнае пытанне адносна сваіх дырэктыў. На сёння іх дзейнічае 11, па нумарацыі — 12 (Дырэктыва № 5 ужо не актуальная). «Прэзідэнт сказаў, што трэба на іх паглядзець. Вядома, не проста ўзяць і адмяніць іх ці перачытаць і пакінуць у той жа колькасці, толькі ўнёсшы нейкія змены. Сказаў, трэба папрацаваць з імі разумна, — адзначыла яна. — Калі яны нам не патрэбныя, то трэба іх, можа быць, і адмяніць. Калі ж яны нам патрэбныя, але мы бачым сумежнасць, то, адпаведна, зрабіць адну, але сучасную, каб усім было зразумела, куды рухацца і як працаваць». Як прыклад — Дырэктыва № 7 «Аб удасканаленні і развіцці жыллёва-камунальнай гаспадаркі краіны» і Дырэктыва № 8 «Аб прыярытэтных напрамках развіцця будаўнічай галіны». Гэтыя дакументы блізкія па духу і па напрамках. «Цалкам магчыма, калі мы прааналізуем гэтыя дзве дырэктывы, зразумеем, што гэта павінна быць адна дырэктыва, якая будзе ісці ад жыцця, ад патрэбы людзей і адкажа на пытанне, як мы будзем развіваць будаўнічую галіну, а разам з ёй і жыллёва-камунальную гаспадарку», — патлумачыла намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Вольга Чупрыс звярнула ўвагу на яшчэ адно важнае пытанне — Закон «Аб нарматыўных прававых актах». Гэта базавы дакумент для ўсіх дзяржаўных органаў, якія працуюць з прававымі актамі. У яго плануецца ўнесці змены, якія будуць прадугледжваць інвентарызацыю заканадаўства з пэўнай перыядычнасцю. Плануецца, што да канца года абноўлены закон будзе прыняты.

У Адміністрацыі Прэзідэнта вялікая колькасць працы звязана з двума кірункамі, якія знаходзяцца пад пільным кантролем кіраўніка дзяржавы. Гэта работа камісіі па пытаннях грамадзянства і памілавання. Вольга Чупрыс прывяла некаторыя лічбы па гэтым кірунку, якія, па яе словах, адлюстроўваюць складанасць і важнасць гэтай работы. У тым ліку і аб'ём работы самога Прэзідэнта, паколькі ўсё, што робіцца ў гэтых камісіях, кладзецца на стол кіраўніку дзяржавы. Каб ацаніць аб'ём гэтай работы, можна прааналізаваць толькі адну лічбу. «Работа камісіі па пытаннях памілавання за апошнія пару гадоў павялічылася ў сем разоў. Штогод цяпер разглядаецца каля паўтысячы матэрыялаў. Гэта ўсё апрацоўваецца, ідзе на даклад да кіраўніка дзяржавы. Маштабы вельмі сур'ёзныя», — заявіла Вольга Чупрыс. Яна адзначыла, што колькасць задаволеных хадайніцтваў аб памілаванні за апошнія два гады значна ўзрасла. «Калі да 2023 года Прэзідэнт прымаў такія рашэнні па не больш чым 10-10,5 % ад агульных хадайніцтваў, то за мінулы год лічба дасягнула 65 %, а ў гэтым годзе (за пяць месяцаў) 50 % хадайніцтваў задавальняецца кіраўніком дзяржавы. Гэта значыць, практычна кожны другі з тых, хто звярнуўся да Прэзідэнта ў пытаннях памілавання, памілаваны кіраўніком дзяржавы», — звярнула ўвагу намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Што датычыцца работы камісіі па пытаннях грамадзянства, то з 2021 года (калі на Вялікай размове ў кіраўніка дзяржавы было даручана выпрацаваць сістэму прадастаўлення грамадзянства перасяленцам з Украіны) у беларускае грамадзянства было прынята амаль 9 тысяч украінцаў. У цэлым жа за пяцігодку на падставе рашэнняў Прэзідэнта беларускае грамадзянства атрымалі 19 тысяч замежнікаў. Са слоў Вольгі Чупрыс, гэта колькасць у 4,5 раза большая, чым колькасць тых, хто выйшаў з грамадзянства Рэспублікі Беларусь. «Гэта сведчыць, што наша краіна ўяўляе цікавасць для замежнікаў. Грамадзянамі нашай краіны за гэты перыяд сталі былыя грамадзяне 51 дзяржавы свету. І Лацінская Амерыка, і, безумоўна, Еўропа, і Азія — прадстаўлены, лічыце, увесь свет, гэта значыць, наша краіна — гэта сапраўды месца, дзе хочацца жыць», — адзначыла яна.

### Сяргей Налівайка: «Не тваіх пытанняў і не тваіх тэм няма»



На нарадзе вялікая ўвага ўдзялялася ролі памочнікаў Прэзідэнта — інспектараў у рэгіёнах. Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці Сяргей Налівайка падзяліўся з журналістамі ўласным досведам. Як вядома, ён доўгі час узначальваў міністэрства па падатках і зборах, і ў некаторых пытаннях, напрыклад сельскай гаспадарцы, было разабрацца складана, аднак прыходзіцца хутка вучыцца і арыентавацца.

Асаблівасцю работы памочнікам Прэзідэнта Сяргей Налівайка назваў неабходнасць унікаць у зусім розныя сферы. «Не тваіх пытанняў і не тваіх тэм няма, — падкрэсліў ён. — Другі аспект — пастаянна сябе стараешся настройваць на тое, каб глядзець на рэчы вачыма Прэзідэнта. Ведаючы яго патрабавальнасць, прынцыповасць, дакладнасць і прадметнасць, гэта не заўсёды атрымліваецца, але прымушае расці, падцягвацца.

Журналісты спыталі, як інспектару па вобласці не паўтараць функцыі мясцовых органаў улады. Сяргей Налівайка заўважыў, што як такога дубліравання няма, таму што ва ўсіх бакоў ёсць дакладнае разуменне: усе працуюць з адной мэтай. Ён падкрэсліў, што мясцовая ўлада канструктыўна ўзаемадзейнічае з памочнікамі Прэзідэнта. «Іншая справа, што калі бачыш на месцы пэўныя недакладнасці ці нюансы, якія можна выправіць, вядома, адразу выпраўляеш. Тым не менш аналізуеш, чаму яны не былі выпраўленыя да гэтага. Калі бачныя нейкія сістэмныя пытанні, то іх падымаеш на больш высокі ўзровень», — сказаў ён.

# «СЁННЯ НЯМА ТЫХ ПЫТАННЯЎ, ШТО НЕ МЕЛІ Б ПАЛІТЫЧНЫ ХАРАКТАР»

**ЧАЦВЁРТАЕ — кантроль за выкананнем даручэнняў Прэзідэнта. Сістэма — патрэбна, адпіскі — не**

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што гэта актуальна і для пісьмовых, і для вусных даручэнняў. Увогуле, гэту функцыю Адміністрацыі Прэзідэнта ён назваў найважнейшай. «Калі гэтага кантролю не будзе, калі вы не даможацеся рэалізацыі даручэнняў Прэзідэнта, Прэзідэнту ў краіне рабіць няма чаго. Аўтарытэт яго будзе падаць. І ўрэшце можам давесці да таго, што народ зразумее: «Навошта гэты Прэзідэнт нам патрэбны наогул?». А ў наш час ён патрэбны (буду я ці нехта іншы). Чалавек адказны, які ідзе наперадзе, на чале, — ён патрэбны. Але калі ён прымае рашэнні, жалезабетонна гэтыя рашэнні павінны быць выкананы. Вось гэта вы можаце зрабіць. Любы з вас, нават без вялікага дзяржаўнага апарату. Што тычыцца права, ідэалагічнай работы ці эканамічнай работы — вы можаце гэта зрабіць. Калі будзе наладжаны сістэмны кантроль», — заявіў беларускі лідар. Але, папярэдзіў Прэзідэнт, шмат пытанняў ён памятае і трымае на сваім кантролі: «І, Дзмітрый Мікалаевіч (кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта — Дзмітрый Крутой. — **«Зв.»**), калі толькі я ўбачу, што з боку Адміністрацыі гэта не атрымала кантролю і развіцця, гэта не ўкаранёна ў жыццё — наракайце самі на сябе. Адпіскі не прымаюцца», — зрабіў акцэнт кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка настойвае на тым, што трэба адыходзіць ад бюракратызму і залішняй папяровай работы. «Кантроль за выкананнем даручэнняў і пісьмовых, і вусных павінен быць сістэматызаваны. У вас павінна быць пэўная сістэма. Сістэма папераджальнага кантролю за выкананнем даручэнняў кіраўніка дзяржавы. Яна быццам бы выбудавана. Але патрэбны вынік. Не адпіскі. Пытанні да забеспячэння якасці і своечасовасці выканання даручэнняў перыядычна ўзнікаюць, калі мякка казаць», — падкрэсліў беларускі лідар.

**ПЯТАЕ — звароты грамадзян. Большасць павінна вырашацца на месцах**

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, у ідэале іх быць не павінна. Як мінімум не ўсе звароты павінны даходзіць да ўзроўню Адміністрацыі Прэзідэнта. Яны павінны вырашацца на месцах, настойвае кіраўнік дзяржавы. «Але калі дайшлі, то ў працэсе разбору варта асаблівую ўвагу ўдзяліць аналізу кампетэнтнасці тых інстанцый, дзе людзі так і не атрымалі дапамогу ў вырашэнні свайго пытання. Вось я часта бачу, высокія службовыя асобы, бываючы на месцах, у тэлевізар заяўляюць: «Вы ведаеце, гэта не нашы пытанні. Гэта трэба было вырашыць на месцы камусьці». Дык навошта ты туды паехаў, калі ты такую заяву робіш? А калі ты прыехаў і вырашаеш гэта пытанне, значыць, гэта і тваё пытанне, ты прыняў такое рашэнне. Але для сябе ты правільна падумай, а хто ж не вырашыў гэта пытанне, хто не адрамантаваў гэты плот і не пафарбаваў яго. Я да прыкладу кажу, пытанні розныя бываюць», — заўважыў Прэзідэнт. Ён адзначыў, што ўлада павінна бачыць і ведаць, што людзі гавораць пра яе ўнутры краіны і за мяжой, з якіх нагод робяць заўвагі. Па ключавых нагодах Адміністрацыя Прэзідэнта павінна інфармаваць кіраўніка дзяржавы. «Збірайце гэту інфармацыю, выводзьце на ўзровень Прэзідэнта для таго, каб я пазнаёміўся і, прыняўшы гэту інфармацыю, прымаў рашэнні», — арыентаваў Аляксандр Лукашэнка.

**ШОСТАЕ — роля інспектараў — памочнікаў Прэзідэнта. Ведаць кожны куток рэгіёна і патрабаваць**

Беларускі лідар нагадаў, што іх функцыянал прадугледжвае абсалютнае пагружэнне ў жыццё рэгіёна. А задача Адміністрацыі зрабіць так, каб памочнікі Прэзідэнта, яны ж інспектары па абласцях і Мінску, працавалі так, як трэба. Кіраўнік дзяржавы даручыў дапрацаваць функцыянальныя абавязкі памочнікаў і ўзмацніць на іх нагрузку. Ён заўважыў, што нярэдкія выпадкі, калі чалавек быццам бы працуе, а на самай справе адседжваецца, чакае прызначэння на новую пасаду. Прэзідэнт заявіў, што гэта ганьба і такога быць не павінна.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на яшчэ адну кадравую праблему — службовыя асобы з цэнтральных органаў улады не асабліва імкнуцца паспрабаваць праявіць сябе на месцах, у рэгіёнах, дзе трэба вырашаць рэальныя, зямныя задачы, а не толькі тэарэтызаваць. Кіраўнік дзяржавы ўспомніў савецкія часы, калі для інструктара ЦК Кампартыі было ўзнагародай прызначэнне на пасаду старшыні выканкама. «Колькі ў нас з цэнтра паехалі і паказалі свой спрыт?» — рытарычна спытаў кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт прывёў у прыклад Кітай, дзе перанялі гэты савецкі вопыт. «І дысцыпліна — дай бог», — заўважыў беларускі лідар.

«Вы павінны быць пагружаныя ў жыццё рэгіёна. Вы павінны ведаць кожны куток рэгіёна і патрабаваць, патрабаваць, патрабаваць, — нагадаў Прэзідэнт памочнікам іх асноўныя абавязкі. — Я павінен не проста ведаць, што, дзе, калі і чаму адбываецца, а бачыць усё вашымі вачыма — што там на месцы, як жывуць нашы людзі на месцах».

Гэта павінна быць добра відаць на праведзенні Года добраўпарадкавання. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што адна з ключавых задач яго памочнікаў у рэгіёнах — зрабіць так, каб кожны жыхар Беларусі на месцах гэта адчуў, адчуў нейкія змены. Кіраўнік дзяржавы нагадаў аб нормах па ўтрыманні тэрыторый, прылеглых да жылых дамоў. Ён запатрабаваў больш актыўна працаваць з людзьмі, даводзіць да іх, што парадак каля дамоў, у першую чаргу, — адказнасць гаспадароў, а не ўлады. Тым, каму патрэбна дапамога, трэба дапамагчы. «А калі хтосьці п'е і бадзяецца, не можа вакол прыбраць, дык прымусьце любым чынам, разам з міліцыяй, але так, каб ён прывёў у парадак свой участак і добраўпарадкаваў яго», — запатрабаваў Прэзідэнт.

## НЕ ГУЛЯЦЬ НА ЧЫМСЬЦІ ПОЛІ

Абагульняючы, Аляксандр Лукашэнка паўтарыў тэзіс, што Адміністрацыя Прэзідэнта — гэта палітычны штаб. «Сёння няма тых пытанняў, якія не мелі б палітычны характар. Апошняя інстанцыя перад прыняццем канчатковага рашэння, вы не павінны ні ў якім разе ўваходзіць у становішча гуляць на чымсьці полі. Вы павінны быць абсалютна незалежнымі, наколькі гэта магчыма, і аб'ектыўнымі. Задача — фарміраваць незалежнае ад астатніх інстытутаў улады меркаванне па ўсіх кірунках рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі. Вы фарміруеце маё меркаванне. Чым больш пунктаў гледжання, тым хутчэй мы знойдзем аптымальнае рашэнне любых пытанняў. Прынцып: я начальнік — ты дурань, вам абсалютна не падыходзіць. Вы павінны калектыўна абмяркоўваць і прымаць рашэнні. А ў мяне на стале павінен быць аналітычны даклад з выразным вызначэннем «галоўнага ўдару» і дзеянняў», — арыентуе Прэзідэнт.

> **Ён падкрэсліў, што Дырэктыву № 11 «Аб удасканаленні функцыянавання сістэмы органаў улады і кіравання, узмацненні выканальніцкай дысцыпліны» ніхто не адмяняў. Павышэнне якасці кіравання ў цэлым, забеспячэнне выканальніцкай дысцыпліны — ключавыя мэты. Акцэнт кіраўнік дзяржавы зрабіў і на выканальніцкай дысцыпліне, нагадаўшы, што без яе не будзе ніякага выніку ў рабоце.**

## СКАРГАЎ У АДМІНІСТРАЦЫЮ ПРЭЗІДЭНТА СТАНОВІЦЦА МЕНШ

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый Крутой далажыў, што са студзеня 2023 года функцыянуе адзіная Рэспубліканская аўтаматызаваная сістэма ўліку і апрацоўкі зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб — усё зведзена ў адным інфармацыйным прадукце. За два з паловай года паступіла 450 тысяч зваротаў ва ўсе органы і арганізацыі. Гэта прыкладна па 200 тысяч зваротаў у год. Паводле яго слоў, сёння сістэма дапрацоўваецца, асабліва механізм справаздачных даных і аналізу гэтых зваротаў. «Па прыкладзе Кітая, можа быць, у бліжэйшы час будзем укараняць алгарытмы і элементы штучнага інтэлекту», — сказаў Дзмітрый Крутой. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта звярнуў увагу, што ў цэлым адзначаецца зніжэнне колькасці скаргаў, якія паступаюць у Адміністрацыю Прэзідэнта. «Гэта для нас ключавы паказчык. У ідэале сапраўды такіх скаргаў не павінна быць у Адміністрацыі, аднак цяпер іх 18–20 тысяч у год, гэта значыць, прыкладна 10 % ад агульнага ліку зваротаў ва ўсе дзяржаўныя органы. Традыцыйныя лідары па сферах у нас не мяняюцца шмат гадоў. Нумар адзін з вялікім адрывам — жыллёва-камунальная гаспадарка — 20 % ад усіх скаргаў на імя Прэзідэнта. Другое і трэцяе месцы — па 5 % — гэта медыцына і зямельныя спрэчкі», — паведаміў Дзмітрый Крутой. Ён адзначыў, што ў сферы ЖКГ неабходна пераламаць гэту тэндэнцыю, у тым ліку з дапамогай асабістага ўдзелу грамадзян у вырашэнні падобных праблем, напрыклад навядзення парадку на сваёй тэрыторыі. Варта ўлічваць, што большасць зваротаў, асабліва ў інтэрнэце, паступае ад адкрытых правакатараў і «канапавых экспертаў».

## УСЁ ПАВІННА КАНТРАЛЯВАЦЦА

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што большасць пытанняў на месцах, якіяператвараюцца ў звароты ў Адміністрацыю Прэзідэнта, павінны вырашацца мясцовымі органамі ўлады, губернатарамі і быць у полі зроку памочнікаў Прэзідэнта — інспектараў. Ён прывёў прыклад з уласнага досведу. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што ў савецкія часы, калі прыязджала службовая асоба кшталту памочніка Прэзідэнта, усе на вушах стаялі, раён быў на асаблівым становішчы. Але і быў вынік. Таму сёння кіраўнік дзяржавы і патрабуе ад сваіх памочнікаў у рэгіёнах дзейнічаць больш прынцыпова і даваць вынік. «Там ёсць губернатар, так. Але ты сваімі метадамі павінен прайсціся так, каб губернатар успацеў пасля вашага наведвання», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Беларускі лідар настройвае і памочнікаў, іншых службовых асоб і асабліва Адміністрацыю Прэзідэнта на аператыўныя, а галоўнае — самастойныя дзеянні. «У нас што ні праблема — хутчэй да Прэзідэнта. Што вы да мяне бегаеце? Вы ведаеце маю пазіцыю. Не трэба крыўдзіць людзей, хто б яны ні былі, калі яны законна працуюць, — сказаў ён. — Калі мы бачым, што нешта не так — трэба закон паправіць. Калі парушаюць — няхай адказваюць, таму ўсё павінна кантралявацца».

Прэзідэнт зрабіў акцэнт на тым, што яго памочнікі — інспектары па рэгіёнах павінны дакладна ведаць, што адбываецца ў абласцях, ведаць, што хвалюе людзей, навучыцца з гэтым працаваць, займацца эфектыўнай контрпрапагандай. У прыклад Аляксандр Лукашэнка прывёў нядаўнія «скаргі» ў інтэрнэце на адсутнасць бульбы ў крамах. Пакуль у сетцы кіпелі абмеркаванні, у той жа час вялікія аб'ёмы гэтай бульбы ляжалі на складах некаторых буйных гандлёвых сетак.

Прэзідэнт падкрэсліў, што кантроль і адказнасць за тое, каб усё было справядліва на месцах — гэта ў тым ліку і абавязак памочнікаў-інспектараў. Яны павінны бачыць сітуацыю і, калі трэба, прымаць меры.

У прыклад ён прывёў сітуацыю з будучым ураджаем садовых культур, які сёлета з-за замаразкаў будзе дрэнным. Па словах кіраўніка дзяржавы, ведаючы сітуацыю, трэба загадзя падумаць над тым, як нарыхтаваць неабходныя аб'ёмы прадукцыі. «Для гэтага мы і ёсць — выпрацаваць сістэму, завезці гэтыя яблыкі, якіх будзе нястача ў гэтым годзе. А яна будзе. Я вось нядаўна па сваім садзе пахадзіў (у мяне там для эксперыменту ёсць) — бачу, што 10–15 % жывыя засталіся завязі, а астатняе трапіла пад мароз. Але нават калі мы гэта збяром і пакладзём, як трэба, на захоўванне, мы не будзем мець праблем», — дадаў ён.

Дзмітрый Крутой адзначыў, што напярэдадні Прэзідэнт падпісаў указ аб асаблівасцях пастаўкі плодаагароднінная прадукцыі для рэспубліканскіх дзяржаўных патрэб, які датычыцца фарміравання стабфондаў. «Я рашэнняў шмат падпісаў, але вы пракантралюйце. Каб было рэалізавана. Толькі мне скажыце, што хтосьці не выканаў. Трэба ўжо выганяць на вуліцу такіх кіраўнікоў», — адказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў, што ў краіне пабудавалі шмат добрых сховішчаў, але некаторыя з іх пустуюць або іх утрымліваюць у неналежным выглядзе. Такое Прэзідэнт назваў злачынствам. І гэта — найперш справа памочніка — інспектара па вобласці. «Ён там вочы і вушы Прэзідэнта», — акцэнтаваў увагу Аляксандр Лукашэнка.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

*Заканчэнне. Пачатак на 2–3-й стар.*

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# «ЗДАРОЎЕ НАЦЫІ — САМЫ ВАЖНЫ НАБЫТАК ГРАМАДСТВА І ДЗЯРЖАВЫ»

## Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў наведалі Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт

У сценах вядучай кузні медыцынскіх кадраў краіны адбылася сустрэча парламентарыяў на чале са Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Ігарам СЕРГЯЕНКАМ з прафесарска-выкладчыцкім складам вышэйшай навучальнай установы.



Фота БелТА.

**Рэктар Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Сяргей РУБНІКОВІЧ** праінфармаваў, што навучальная ўстанова захавала найлепшыя традыцыі савецкай медыцынскай адукацыі. У цяперашні час, па яго словах, навучанне ва ўніверсітэце праходзіць 8 тысяч студэнтаў. Высокім попытам беларуская медыцынская адукацыя карыстаецца і за мяжой: за гады інстытута Прэзідэнцтва колькасць замежных студэнтаў павялічылася ў 10 разоў. Над тым, каб забяспечыць навучэнцаў усімі неабходнымі ведамі як у тэорыі, так і на практыцы, працуе больш як 1500 прафесараў і выкладчыкаў. Штогод ва ўніверсітэце праходзіць перападрыхтоўку звыш 20 тысяч урачоў з усёй краіны. БДМУ забяспечвае самы высокі паказчык па мэтавым навучанні.

### ДАСТУПНАСЦЬ, ЯКАСЦЬ І ЛІЧБАВІЗАЦЫЯ

Звяртаючыся да прафесарска-выкладчыцкага складу, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергяенка адзначыў: «Здароўе нацыі — гэта самы важны набытак любога грамадства і дзяржавы. Таму клопат аб развіцці сістэмы аховы здароўя, удасканаленне падрыхтоўкі кадраў былі і застаюцца прыярытэтамі дзяржаўнай палітыкі, ключавымі складнікамі канцэпцыі нацыянальнай бяспекі. Як падкрэсліў Прэзідэнт нашай краіны, выступаючы на VII Усебеларускім народным сходзе, па даступнасці медыцынскіх паслуг Беларусь займае адно з вядучых месцаў у свеце, а айчынная адукацыя стала сапраўды народным здабыткам. Гэта вынік пільнай увагі з боку дзяржавы да пытанняў аказання медыцынскай дапамогі, пачынаючы з фельчарска-акушэрскіх пунктаў, заканчваючы найбуйнейшымі навукова-практычнымі цэнтрамі, якія адпавядаюць самым высокім стандартам».

Ігар Сергяенка канстатаваў, што асноўныя задачы ў медыцыне — гэта даступнасць, якасць і лічбавізацыя. «Практычна ў кожнай вобласці сёння функцыяніруе не менш за тры міжраённыя цэнтры медыцынскай дапамогі, развіваюцца і раённыя бальніцы, ствараецца электронная база пацыентаў, — канкрэтызаваў ён. — Сёння ў Беларусі гарантавана бясплатная даступная медыцынская дапамога дзяржаўных медыцынскіх устаноў з бюджэтнай сістэмай фінансавання. І да гэтага людзі нашы прывыкаліся і ўспрымаюць як данасць».

У той жа час, як прывёў лічбы спікер, кошт аднаго выезду брыгады хуткай дапамогі летась ацэньваўся ў 164 рублі. Прыкладна столькі ж абыходзіцца дзяржаве адзін дзень знаходжання пацыента ў тэрапеўтычным аддзяленні. У хірургічным — 195 рублёў, у рэанімацыі — 1200 рублёў. І гэты клопат аб людзях бярэ на сябе дзяржава.

### У АДПАВЕДНАСЦІ З НАЙЛЕПШЫМІ СУСВЕТНЫМІ СТАНДАРТАМІ

«Забяспечанасць насельніцтва медыцынскімі работнікамі ў Беларусі апераджае многія еўрапейскія краіны, — акцэнтаваў увагу спікер. — Такія як Швейцарыя, Балгарыя, Нідэрланды, Літва, Аўстрыя. Не саступае найлепшым сусветным стандартам і кваліфікацыя нашых медыкаў. Толькі летась для атрымання медыцынскіх паслуг Беларусь наведалі 160 тысяч замежных грамадзян са 159 дзяржаў — на 20 % больш, чым у папярэднім годзе. Большая частка тых, хто праходзіў лячэнне і звяртаўся па медыцынскія паслугі ў нашу краіну, — з Расіі, Казахстана, Латвіі, Сербіі і Кітая».

Пры гэтым Ігар Сергяенка падкрэсліў, што сёння краіне патрэбны дасведчаныя ўрачы — высокамаральныя, рознабаковa адукаваныя асобы, сапраўдныя патрыёты сваёй зямлі, надзейная апора і змена ў будучыні. І вядучая роля ў гэтым, па яго словах, належыць навучальным установам, найперш галоўнай ВНУ ў сферы медыцыны. «Ваша асноўная задача — падрыхтоўка спецыялістаў з вышэйшай медыцынскай адукацыяй, недахоп якіх мы адчуваем на працягу апошніх гадоў, — звяртаючыся да прысутных, адзначыў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Для таго каб выправіць сітуацыю, у маштабе дзяржавы рэалізуецца комплекс мер па ўдасканаленні работы з кадрамі».

Сярод іх — стварэнне спрыяльных умоў для падрыхтоўкі медыцынскіх кадраў і замацавання іх на працоўных месцах, заканадаўчае ўрэгуляванне пытання замяшчэння няпоўных ставак пасад, перагляд падыходаў да праведзення ўступнай кампаніі, павелічэнне бюджэтных месцаў у медыцынскіх ВНУ, падрыхтоўка ў медыцынскіх каледжах на аснове агульнай базавай адукацыі, змяненне падыходаў да размеркавання выпускнікоў медыцынскіх універсітэтаў, прыняцце мер па павышэнні прафесійнага ўзроўню медыцынскіх работнікаў, забеспячэнне жыллём маладых спецыялістаў і работнікаў, з якімі заключаецца кантракт тэрмінам на пяць гадоў.

Рэзюмуючы, спікер адзначыў, што на кантролі дэпутацкага корпуса знаходзяцца ў тым ліку пытанні, звязаныя са сферай аховы здароўя. Працуючы ў акругах, парламентарыі вывучаюць сітуацыю на месцах, збіраюць меркаванні людзей, каб пры неабходнасці выйсці на канкрэтную заканадаўчую ініцыятыву.

У завяршэнні сустрэчы калектыў універсітэта, канкрэтныя супрацоўнікі былі ўзнагароджаны Падзякай Старшыні Палаты прадстаўнікоў.

**Вераніка КАНЮТА.**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# МІНСК — БЕЙРУТ: НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ АДНО ДЛЯ АДНАГО

## Беларусь цікавяць перспектывы рынку Блізкага Усходу, а Ліван — выхад на прасторы ЕАЭС

Ад паставак прадуктаў харчавання, ветпрэпаратаў і сельгастэхнікі да пытанняў навучання кадраў і стварэння сумесных прадпрыемстваў — беларуская ўрадавая дэлегацыя на чале з намеснікам Прэм'ер-міністра Віктарам КАРАНКЕВІЧАМ на гэтым тыдні правяла серыю сустрэч у Ліване.

Добры жэст, які падкрэслівае ў першую чаргу сяброўскія адносіны паміж дзяржавамі і народамі, — падарунак ад Прэзідэнта і беларускага народа: ліванскаму народу былі перададзены машыны хуткай дапамогі і прадукцыя беларускай вытворчасці. Падчас лютаўскага візіту ліванскаму лідару ўручылі сертыфікат, а 11 чэрвеня ўжо даставілі самі машыны. 10 аўтамабіляў хуткай дапамогі ў самы бліжэйшы час паступяць у мясцовыя бальніцы.

— Для нас вялікі гонар знаходзіцца тут. Ёсць магчымасць па даручэнні Прэзідэнта перадаць гэты дар ліванскаму народу, — адзначыў намеснік Прэм'ер-міністра Беларусі Віктар Каранкевіч.

Тое, што робіць Беларусь для Лівана, не застанецца незаўважаным кіраўніцтвам краіны. Падчас сустрэчы на вышэйшым узроўні бакі замацавалі ўзаемны намер стаць яшчэ бліжэй адно да аднаго.

**Прэзідэнт Лівана Жазэф АУН** цёпла сустрэў беларускую дэлегацыю.

— Я рады зноў бачыць вас у Ліване. Вельмі рады прымаць вас у прэзідэнцкім палацы. Мы высока цэнім ваш падарунак і цікавасць да нашай краіны.

Са слоў **міністра аховы здароўя Лівана Ракана НАСРЭДДЗІНА** значэнне гэтага жэсту для ўмацавання дружбы і супрацоўніцтва паміж краінамі складана пераацаніць.

— Дзякуй вялікі Беларусі, Прэзідэнту і вашаму народу за машыны і прадукты харчавання. Вельмі важна, што вы падтрымліваеце нашу медыцыну.

Віктар Каранкевіч дадаў, што сёлета таксама плануецца пастаўка фельчарска-акушэрскага пункта на колах на базе шасі МАЗ.

— Гэта тэхніка добра зарэкамендавала сябе. У адрозненне ад машын медыцынскай хуткай дапамогі, гэта ўжо дыягнастычны цэнтр, дзе можна праводзіць паўнавартаснае дыягнастычнае лабараторнае даследаванне».

Перспектывы супрацоўніцтва з урадавым блокам краіны абмеркавалі з прэм'ер-міністрам Лівана. Дарожную карту трэба будзе напоўніць канкрэтнымі праектамі ва ўсіх галінах. Гаворка ідзе пра пастаўкі пажарных машын. У сельскай гаспадарцы патрэбная тэхніка і тэхналогіі.

Паводле слоў **намесніка міністра прамысловасці Беларусі Андрэя КУЗНЯЦОВА**, ліванскаму боку неабходна дапамога ў механізацыі сельскай гаспадаркі.

— Мы ім прапануем комплекс рашэнняў. Мы працуем ужо і ў Паўднёвай Афрыцы, таму тэхніка наша прыстасаваная, мы забяспечым тут як сэрвіснае абслугоўванне, так і гарантыйнае.

Беларусь гатова рэалізаваць той патэнцыял, які яна напрацавала за гады сваёй дыпламатычнай прысутнасці ў рэгіёне Блізкага Усходу па ўсіх ключавых напрамках.

Як растлумачыў **першы намеснік міністра замежных спраў Беларусі Сяргей ЛУКАШЭВІЧ**, беларускі бок складае ланцужок узаемадзеяння з Ліванам.

— Інтэнсіўна падтрымліваем тэмп, не сыходзім з нашых пазіцый і дамоўленасцяў. У іх ёсць жаданне развіваць з намі супрацоўніцтва, а ў нас ёсць тут свае інтарэсы. Мы рухаемся сюды і ніколі не сыходзілі. Але ў пэўныя моманты мы дзесьці акцэнтуем нашы намаганні і ўвагу на пэўных пунктах. У дадзеным моманце пунктам гэтым з'яўляецца Бейрут. Ключавым у гэтым супрацоўніцтве з'яўляецца ўзаемная цікавасць. Для Беларусі гэта перспектывы рынку Блізкага Усходу, а Лівану цікавы выхад на прасторы ЕАЭС.

Па выніках ліванскай камандзіроўкі вырашана дэталёва прапрацаваць дарожную карту супрацоўніцтва, у якой пад кожнай канкрэтнай сферай будуць замацаваны канкрэтна адказныя людзі. Курс краінамі ўзяты, цяпер важна набраць хуткасць і трымаць высока.

**Па матэрыялах «Першага інфармацыйнага».**

Брестский филиал
РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ
ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Лот: капитальное строение с инвентарным номером 100/U-90491 (наименование: незавершенное законсервированное капитальное строение; назначение: здание неустановленного назначения), площадью 2754,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Знаменский с/с, 120/18, на земельном участке с кадастровым номером 121280800001000025, площадью 0,2478 га**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (без учета НДС)** | **59 800,00** | **Размер задатка, руб.** | **5 980,00** |

**Продавец:** ОАО «СКО «Брестагроздравница», Брестская обл., Брестский р-н, район п. Берестье, тел./факс 80162 94 13 34. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенного договора купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 01 июля 2025 г. в 12.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** а также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329, в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 30 июня 2025 г. до 17.00**



ИЗМЕНЕНИЯ В ДОПОЛНЕНИЯ
К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ
ООО «НикаПроект»,

*опубликованные в газете «Звязда» от 26.02.2021 г.*

**по объекту:**
**«Многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями на пересечении ул. Прилукской – ул. Глаголева – пр. Жукова в г. Минске»**
**3-я очередь строительства. 3-7-я секции**

**Характеристика объекта строительства:** Проектной документацией предусматривается строительство встроенного нежилого помещения общей площадью 100,00 кв. м, расположенного в 6-й секции на 3-м нежилом этаже с обособленным входом непосредственно с улицы со стороны пр. Жукова с уровня земли.

Высота помещения составляет 2,63 метра. Встроенное помещение изолировано от жилой части дома глухими стенами и перегородками. Окна и входные двери – витражные из алюминиевых профилей с заполнением стеклопакетами. В качестве наружной отделки стен применяются навесной «вентилируемый фасад» с применением керамогранитных плит. Проектом предусмотрено создание безбарьерной среды, а также благоустройство территории в границах работ 3-й очереди.

Встроенное помещение передается с черновой внутренней отделкой: штукатурка стен, стяжка пола. Система отопления встроенного помещения выполняется отдельно от системы отопления жилого дома, с установкой индивидуального прибора учета тепла. Отопление водяное, предусмотрена вертикальная и горизонтальная (в конструкции стяжки пола) разводка, отопительные приборы. Система вентиляции встроенного помещения – приточно-вытяжная механическая и частичная естественная вентиляция (приток) с механической вытяжкой. Водоснабжение встроенного помещения – от отдельной системы водопровода низкого давления с установкой индивидуальных приборов учета потребляемой воды, предусмотрена установка и подключение унитазов

Электроснабжение: предусмотрена установка вводно-распределительных щитков. От каждого вводно-распределительного щитка предусмотрено подключение оптического модема, системы вентиляции, щитка пожарной сигнализации, дополнительно предусмотрен резерв.

